УДК 687.1;391

Навуч. Я.А. Ганус; навуч. В.А. Камінская
Навук. кір. выкл. Н.М. Лісіца
(Філіял БДТУ «Полацкі дзяржаўны лясны каледж»)

ВЫКАРЫСТАННЕ ЭЛЕМЕНТАЎ ТРАДЫЦЫЙНАГА ДЭКОРА Ў СУЧАСНЫМ АДЗЕННІ

На працягу гістарычнага і культурнага развіцця склаліся найбольш дарэчныя формы адзення, яе крой, разнастайныя метады і спосабы дэкаратыўнага афармлення. Сярод іх вядучае месца займае вышыванка. Яна шырока выкарыстоўвалася ў народным касцюме і ў побыце. Вышыўка беларускага касцюма багатая і разнастайная. Ёю ўпрыгожвалі жаночыя і мужчынскія кашулі, верхнюю вопратку, галаўныя ўборы, аксесуары. Матывы арнаменту, кампазіцыі, колеру перадаваліся з пакалення ў пакаленне, становячыся традыцыйнымі.

Вышыванка – гэта беларуская нацыянальная вопратка, якая ў наш час становіцца больш папулярнай. Нашы продкі не насілі вышыванае адзенне кожны дзень, яны бераглі яе для асаблівых урачыстых выпадкаў. Адзенне, аздобленае ўзорамі, захоўвалася для вяселля і іншых святаў, была “выхадная”.

Сярэднекантынентальны досыць халодны клімат Беларусі застаўляў насіць цёплае і закрытае адзенне з мясцовай сыравіны - ільну, радзей каноплі, воўны натуральнай і паўнатуральнай, вытканай у хатніх умовах, на кроснах. У сувязі з тым, што праз Беларусь ішоў гандлёвы шлях, завозіць фабрычную тканіну пачалі значна раней. Таму вырабы з самаробнай тканіны амаль не захаваліся.

Колер рэчам надавалі прыродныя фарбавальнікі: настоі траў, кара, лісце, балотная жалезная руда. Для тканіны, выраблена з ільну, для кашулі, фартуха, галаўных убораўфарбаванне не прымянялася. На белую тканіну часцей наносіўся чырвоны геаметрычны арнамент, выкананы спосабам натыкання ці вышыўкі. Чырвоны колер -сімвал жыцця, акрамя гэтага ён выконваў функцыю засцерагальнага абярэга. Калі арнаментам расшывалі каўнер, пазухі, рукавы, ніз адзення, лічылі, што гэта засцерагала чалавека ад сурокаў, чорнага вока і надавала жыццёвыя сілы. З 19 стагоддзя ў вытворчасці ўзніклі анілінавыя фарбы і фабрычныя ніткі, і ў адзенні з’явіліся аранжавы, фіялетавы, блакітны, малінавы, ярка – зялёны колеры.

Асаблівай фантазіяй у выкананні, колерах, вышыўцы вызначаўся жаночы касцюм. Кашулю насілі заўсёды, у любым узросце, людзі любага сацыяльнага статуса кожны дзень. Традыцыйны быў у кашулі тунікаподобны крой, яе

ўпрыгожваліўстаўкі- полікі. Матэрыял для кашулі браўся ў залежнасці ад матэрыяльнага становішча, таму гэта мог быць як кужаль, так і бавоўна, шоўк. Бяднейшыя людзі маглі шыць будзенныя сарочкі з кужалю верхнюю частку (чэхлік), а ніжнюю (постаўку) – з грубай таннайтканіны. Паўсядзённая кашуля аздаблялася нешырокім стаячым або адкладным каўняром, а святочная – шыкоўным хвалепадобным каўняром, і нават здымным.Шыкоўная вышыўка або тканыарнамент упрыгожвалі плечы, манжэтырукавоў, каўнерык вырабу.Адзенне ў беларускіх жанчын было дастаткова разнастайным, і нават спадніцы былі многіх відаў і назваў (андарак, палатнянік, саян, летнік), панёвы, фартухі. Андарак шылі з тонкага сукна дамашняга вырабу і часцей за ўсё ўпрыгожвалі тканым арнаментам, і на чырвоным, сінім, чорным фоне з'яўляліся вузкія рознакаляровыя палоскі вішнёвага, зялёнага, блакітнага, чорнага і іншых колераў. Узоры маглі ўтвараць прыгожыя гарызантальныя палоскі рознай шырыні. Для дэкарыравання выкарыстоўвалі цясёмкі і стужкі. Вылікай папулярнасцю карысталіся шыкоўныя гафрыраваныя андаркі. Іх акуратна складвалі ў гармонік, адпарвалі загорнутым ў ручнік гарачым хлебам, пасля – прэсавалі.Панёва– адзенне, якое насілі паверх кашулі як спадніцу, і складалася з трох сшытых полікаў. Наверх яе завязвалі фартух. Выкарыстоўвалі нераспашныя глухія панёвы, полкі якіх сшываліся напалову зверху. Сустракаліся панёвы - плахты, полкі якіх сшываліся ўверсе, і ромбам спускаліся на кашулю. Падол кашулі расшывалі або ткалі арнамент, бо панёва шылася карацей за кашулю.

Абавязковым і непасрэдным элементам нацыянальнай адзежы беларусаў быў рознакаляровы, звычайна чырвона – зялена - белага арнаменту, пояс - тканы, плецены ці вязаны, з кутасамі,махрамі або пампонамі. З`явіцца на людзях без пояса лічылася непрыстойнасцю, нявыхаванасцю. Адсюль і пайшоў выраз "распаясаўся". Найбольш пашыраныя паясы шырынёй ад 2-3 да 20-30 см, даўжынёй да 2 - 3 м іболей. Апаясваліся 2 - 3разывакол таліі ізавязваліся збоку, канцы звісалі амаль да каленяў. Зараз на Беларусі вырабляюць тканыя паясы ў г. Слуцку на базе музея слуцкіх паясоў.

Галаўныя ўборы – неад'емная частка нацыянальнага адзення беларусаў, у іх вызначалася сацыяльнае і сямейнае становішча. Вырабляліся яны з мануфактурных тканін (аксаміта, парчы, шоўка), футра собаля, куніцы, бабра, лісы, вавёркі, багата аздаблялі каштоўнымі камянямі, жэмчугам, пер'ем, вышыўкай і карункамі з залатых і срэбраных нітак. Жаночыя галаўныя ўборы, асабліва святочныя, былі багатыя на формы, спосабы нашэння, майстэрства,

вытанчанасцю выканання. Дзяўчаты зачэсвалі валасы на прамы прабор, запляталі ў 1-2 касы з каснікамі (рознакаляровымі стружкі, паскамі тканіны, ніткамі бісеру). Гэта маглі быць абручыкі ці перавязкі - ручнікі, у выглядзе вянка, скіпдачкі, кубка, хусткі. Вельмі маляўнічымі былі вясельныя, купальскія ўборы, іх упрыгожвалі кветкамі, галінкамі дрэў, стужкамі, пер'ем.Замужнім жанчынам не дазвалялася паказвацца на людзях з непакрытай галавой, таму іх ўборы былі разнастайныя і складаныя па сваёй будове і спосабу нашэння, але больш сціплыя па ўпрыгожванні. Увогуле галаўныя ўборы надавалі жанчыне велічнасць і статнасць, як бы скульптурную ізысканасць і цэласнасць. Жаночыя галаўныя ўборы падзяляюцца на ручніковыя, па назвах яны былі разнастайныя: намітка, сярпанка, хустка; рагацістыя: галовачка, рожкі, сарочка; каптуровыя: каптур, чапец, наколка. Не было летніх і зімовых галаўных убораў, проста ў холад на іх вязалася хустка.

Абутак – неабходная неад'емная частка адзення, якая дапаўняе яго ў адзінае цэлае. Аднымі з самых пашыраных з'яўляліся скураныя або плецяныя лапці. Амаль у кожнага селяніна было некалькі пар лапцей, яны пляліся з ліпавай або лазовай кары, бяросты, паньковых або льняных аборак. Было 2 тыпы лапцей у залежнасці ад тэхнікі вырабаў: прамога (пашыраны паўсюдна) і касога (на ўсходзе Беларусі) пляцення. Самымі пашыранымі былі лапці з глыбокім закрытым носам - кавярзні. На Віцебшчыне, часткова Магілёўшчыне плялі шчарбакі (бяспятнікі) - неглыбокія, можна сказаць з адной падэшвы. Можна было сустрэць лапці, у якіх спераду былі дзве шырокія лыкавыя пятлі і запятак, а з кожнага боку – пара вузкіх петляў для прадзявання абор. Называлі іх шчарбакі, насілі іх ўлетку на палявых работах. На Палессі, поўдні Гродзеншчыны і Міншчыне насілі "зрачыя лапці", у якіх насок пасярэдзіне зверху быў адкрыты –"вока".

У канцы 19 – пачатку 20 ст. атрымалі распаўсюджанне валёнкі, якія насіліся ўзімку. Да падэшвы валёнак прышываліся тоўсты лямец або кусочкі скуры. Пазней на валёнкі прыдумалі надзяваць гумавыя галошы. Па абутку можна было вызначыць мясцовыя традыцыі, пол, узрост, статус гаспадара. Зараз таксама вельмі модным зімнім абуткам з'яўляюцца валёнкі.

Важнае сімвалічнае значэнне мае колер у любым нацыянальным касцюме. У касцюме беларуса выкарыстоўваліся тры колеры: чырвоны, белы, чорны. Усе яны носяць сакральны сэнс. Белы колер сімвалізуе чысціню і свет, з'яўляецца сімвалам карысці, сілы і здароўя, чысціні, жыцця, урадлівасці і пладавітасці.Чырвоны колер атаясамліваецца як з дабром, так і са злом, нясе сілу і жыватворную

кроў для чалавека, жывёлы, птушкі.Чорны колер –негатыўны, сімвал зла, няшчасця, хваробы, смерці, ночы, цемры.

Канешне, кожны ўзор на вышытым ці вытканым адзенні штосьці сімвалізуе. Ва ўзорах тканых і вышываных вырабаў зашыфраваны аповяд пра жыццё народа, прыроду, людзей. Беларускі арнамент можна падзяліць на тры асноўныя катэгорыі:*геаметрычны* – арнамент, які складаецца з прамых ліній, геаметрычных фігур - прамавугольнікаў, квадратаў, ромбаў; *раслінны* - створаны на аснове малюнкаў раслін, лісця, кветак ці пладоў; *жывёльны* - які ўключае ў сябе выявы жывёл і птушак.

Белая вышытая сарочка, так званая вышыванка, - неадемная складовая частка жаночага і мужчынскага беларускага нацыянальнага адзення. Вышытая сарочка была характэрнай прыкметай кожнай мясцовасці. У многіх культурах ў розныя стагоддзі аддзенне з вышыўкай было сведчаннем дабрабыту.